ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 4 (942) | АЎТОРАК, 24 лютага 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

Чарговае пасяджэнне Савета рэктараў, якое адбылося ў першай дэкадзе лютага, было незвычайным. Яно праходзіла ў абласным выканаўчым камітэце з удзелам яго кіруючых работнікаў. І гэта не выпадкова, бо абмяркоўвалася жыццёва важнае пытанне -- аб перспектывах развіцця вышэйшай школы рэгіёна.

З грунтоўным дакладам выступіў старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны, рэктар нашага універсітэта, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткоў. Ён адзначыў не толькі станоўчае ў вырашэнні адной з самых актуальных праблем, але і ўказваў на істотныя недахопы, якія маюць месца ў некаторых ВНУ і, у прыватнасці, кааператыўным інстытуце.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел усе рэктары ВНУ, а таксама старшыня аблвыканкома М.Р.Вайцянкоў, яго першы намеснік А.С.Якабсон, намеснік -- А.М.Ярчак, старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктар Інстытута лесу НАН Беларусі акадэмік В.А.Іпацьеў, начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкома М.Я.Кобрынскі.

Размова, якая ішла на сумесным пасяджэнні Савета рэктараў і кіруючых работнікаў абласнога рангу, была прынцыповай і бескампраміснай. Выпрацаваны дакумент павінен паспрыяць узняццю вышэйшай школы на якасна новы ўзровень.

Хроніка

## У ГЕОЛАГАЎ І ГЕОГРАФАЎ -- НОВЫ ДЭКАН

Па ўласнай просьбе ад абавязкаў дэкана геолага-геаграфічнага факультэта вызвалены кандыдат геолага-мінералагічных навук прафесар А.П.Пінчук. Адам Пятровіч па-ранейшаму ўзначальвае кафедру геалогіі і разведкі карысных выкапняў.

Новым дэканам геолага-геаграфічнага факультэта загадам па універсітэту з 10 лютага назначаны кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт кафедры геаэкалогіі Георгій Анатольевіч Сербін.

## АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС

на лепшую навукова-даследчую работу ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны.

Конкурс праводзіцца ў тры этапы: кафедра -- факультэт -- конкурсная камісія.

Работы ў конкурсную камісію павінны быць прадстаўлены не пазней 31 сакавіка 1998 года.

**За даведкамі звяртацца ў службу навукова-тэхнічнай інфармацыі: 5-ы корпус, п. 5-14, тэл. 56-73-38.**

## НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ-ЛАБАРАТОРЫІ

Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці музей-лабараторыя Ф.Скарыны нашага універсітэта паступова папаўняецца новымі экспанатамі.

У пачатку лютага 1998 г. Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь падарыў музею-лабараторыі карціну беларускага і літоўскага жывапісца і графіка Пятра Аляксандравіча Сергіевіча (1900-1984 г.г.) "Ф.Скарына ў друкарні" (1957 г.).

На вялікім фармаце (132х165) поўна і аб'ёмна адлюстравана друкарня Скарыны. Мастак паказаў беларускага асветніка ў час друкавання кнігі. Ён стаіць з толькі што адціснутым лістом у руках, ажыўлены і радасны. Гэты настрой падзяляе памочнік-друкар.

П.А.Сергіевічу ўдалося стварыць адзін з цікавейшых вобразаў Францыска Скарыны ў жывапісе. Карціна вызначаецца майстэрствам кампазіцыі, дакладнасцю малюнка, рэалістычнай трактоўкай вобраза першадрукара. Таму яна стала каштоўнейшым экспанатам музея. Цэннасць карціны падкрэсліваецца і тым фактам, што паўтор яе знаходзіцца ў Літоўскім дзяржаўным краязнаўчым музеі.

Да 30-годдзя універсітэта, якое будзе адзначацца ў маі 1999 г., музей-лабараторыя Ф.Скарыны рыхтуе шырокамаштабную экспазіцыю "Гісторыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны". У апошні час у нас з'явілася шмат архіўных дакументаў пра Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава (1930-1969 г.г.), на базе якога быў створаны універсітэт, матэрыялаў аб яго мінулым.



Дар музею-лабараторыі

Калектыў музея-лабараторыі сабраў невялікую бібліятэку манаграфій, вучэбных і метадычных дапаможнікаў, часопісных і газетных артыкулаў, іншых прац выкладчыкаў універсітэта.

Мастаком С.Рудштэйнам выкананы графічныя партрэты шырока вядомых вучоных, якія працавалі ў нашай навучальнай установе: былога загадчыка кафедры педінстытута, акадэміка АН Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, заслужанага дзеяча навукі С.А.Чуніхіна, першага рэктара універсітэта, акадэміка АН БССР, доктара фізіка-матэматычных навук У.А.Белага і другога рэктара ГДУ, акадэміка АН БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, доктара фізіка-матэматычных навук Б.В.Бокуця.

**Валянціна ЯЦУХНА, супрацоўніца музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

## ЮБІЛЕЙНАЯ ДАТА СЛАЎНАГА СЫНА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

*Беларускі народ шырока, з вялікай павагай і любоўю адзначыў 80-гадовы юбілей аднаго з лепшых сваіх сыноў, актыўнага стваральніка на Віцебшчыне партызанскага руху ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, таленавітага важака моладзі ў пасляваенны час, выдатнага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы Пятра Міронавіча Машэрава.*

*13-га лютага – у дзень нараджэння нашага слыннага суайчынніка ўрачыстае пасяджэнне адбылося і ў Гомельскім абласным драмтэатры. У адрас П.М.Машэрава было выказана шмат цёплых хвалюючых слоў як у дакладзе намесніка старшыні аблвыканкома В.С.Ахлесціна, так і ў выступленнях прадстаўнікоў старэйшых і малодшых пакаленняў. Ад імя першых сваімі ўспамінамі пра Пятра Міронавіча падзяліўся Герой Сацыялістычнай Працы, доктар педагагічных навук, прафесар кафедры педагогікі нашага універсітэта, заслужаны настаўнік БССР М.А.Дзмітрыеў. Яго выступленне прапануем увазе чытачоў.*

*Слова ад Беларускага патрыятычнага саюза моладзі меў старшыня камітэта БПСМ ГДУ Андрэй Гарбачоў.*

# "МЫ ХОТИМ, ЧТОБЫ У НАС БЫЛО ЛУЧШЕ"

Я знал, глубоко уважал и с любовью относился к Петру Мироновичу Машерову. Мне посчастливилось слушать его на съездах (учительском и профсоюзном), на бюро ЦК КПБ. Всегда с интересом читал его многочисленные статьи, выступления и доклады, напечатанные в прессе.

У меня сложилось убеждение, что Петр Миронович Машеров имел яркий природный ум, высокие нравственные качества и непреодолимую веру в неиссякаемые силы белорусского народа, который выучил и воспитал его, сделал, божьей милостью, Учителем и воспитателем этого народа. Своего наивысшего расцвета Беларусь достигла именно в годы, когда на вершине власти стоял П.М.Машеров, за что он и получил самую высшую награду — любовь народа. Об этой награде сам Машеров писал: "Человеческая любовь. Что есть самое ценное в людях, человеческое? Любовь. Убежденность. Преданность. Обязательно растущий интеллект. Способности".

Все эти качества ценил П.М.Машеров в людях и развивал у себя: любовь, трудолюбие, доброту, принципиальность, приветливость, щедрость души, убежденность, преданность, интеллектуальность, нестандартность мышления. Ему хотелось, чтобы все лучшее зарождалось, приживалось в нашей республике.

Петр Миронович Машеров учился мудрости у своего народа. Он был всегда требовательным к себе. Помню его звучный, с приятным тембром, голос, элегантную фигуру, подтянутость, подвижность, умный взгляд, доверительность...

Мне хочется обратить внимание на образ мышления государственного деятеля П.М.Машерова: ему были чужды псевдообразы, стереотипы, неясные, абстрактные идеи и идеалы, логические несоответствия. С высоких трибун и в своих многочисленных статьях из его уст и из-под его пера ключом била творческая мысль. И он никогда не поучал, а учил и воспитывал подкреплять слово делом, быть не над всеми, а со всеми. В моем домашнем архиве хранится статья Машерова "Наследники подвига", напечатанная в "Комсомольской правде" 20 сентября 1980 года. П.М.Машеров с отеческой заботой о патриотическом воспитании молодежи от имени ЦК КПБ дал ответственное задание комсомолу записать рассказы всех участников и очевидцев ратных и трудовых подвигов и свершений в годы тяжелых испытаний. Забота о воспитании и образовании детей и юношества оставалась для него одним из главных дел на протяжении всей жизни.

Зная, как молодежь любит песни, Петр Миронович Машеров попросил поэта Н.Добронравова и композитора А.Пахмутову сделать подарок белорусской молодежи. И появилась песня:

*"Молодость моя, Белоруссия.*
*Песни партизан, алая заря...".*

Этой песне стоя аплодировали в 1978 году на Кубе участники XI Всемирного фестиваля молодежи, а белорусскую делегацию возглавлял П.М.Машеров. Он олицетворял собой особую простоту, героичность, национальную гордость белорусского народа.

Хотя тактичность и человечность, доброжелательность и душевная щедрость были свойственны Машерову, но в характере его были и бескомпромиссность, непримиримость, а то и жесткость, когда он сталкивался с несправедливостью, равнодушием, нечестностью.

Уверен: ученые-исследователи ещё скажут свое слово о неординарной личности Машерова, масштабности его мышления, теоретическом предвидении развития мировой цивилизации и вместе с ней — развития нашей республики. Возникает вопрос: а не слишком ли мы идеализируем личность П.М.Машерова? Но напрашивается и встречный вопрос: почему в Беларуси и во всех странах бывшего СССР и за рубежом вспоминают П.М.Машерова с такой благодарностью? Между тем П.М.Машеров видел недостатки в жизни страны и в своей деятельности и потому заявлял: "У нас есть недостатки. Мы хотим, чтобы у нас было лучше и за это боремся. Борьба за новое общество многого требует, и не каждому это дело под силу.

Непросто и нелегко было П.М.Машерову добиваться этого "лучшего" для Беларуси в условиях тоталитаризма. Но Петр Миронович умел находить формулу успеха.

П.М.Машеров выступал против замалчивания истории, ее фальсификации, критиковал времена "охоты на ведьм", сам пережил несправедливое навешивание ярлыка "сына врага народа" (его отец умер в ГУЛАГе по обвинению в хранении Библии), выстоял и отстоял многих людей по обвинению их в "национализме". Он выступал против лживых учебников для учащихся, против издержек детской литературы, против восхваления мнимых достижений "развитого социализма". Двенадцать раз переписывался доклад к Пленуму ЦК по идеологическим проблемам: под влияниям догм и стереотипов в доклад попадали целые куски идеологической лжи, рекомендованной сверху.

Трудно назвать какую-либо отрасль экономики, образования, культуры, науки, которая не поощрялась бы Петром Мироновичем Машеровым, не составляла бы его заботу.

Заканчивая свое скромное слово об этом незаурядном, выдающемся педагоге-воспитателе, государственном и партийном деятеле, хотелось бы высказать несколько пожеланий. Во-первых, было бы желательно издать собрание его речей, выступлений, статей отдельной книгой (книгами), чтобы была создана возможность для исследования опыта государственной и партийной деятельности Машерова и использования его в строительстве нашей жизни, в воспитании людей.

Во-вторых, настало время воздвигнуть памятник Петру Мироновичу Машерову на проспекте его имени в Минске. Хочется выразить благодарность и признательность Президенту Республики Беларусь А.Г.Лукашенко за то, что в своей государственной и политической деятельности он воспринял многие идеи П.М.Машерова и ведет линию на дальнейшее развитие родной Беларуси, процветание ее народа и успешно преодолевает трудности на этом пути.

**М.ДМИТРИЕВ,**
**профессор кафедры педагогики, доктор педагогических наук, Герой Социалистического Труда, заслуженный учитель БССР.**





# КІТАЙ: КРАІНА І ЛЮДЗІ

У канцы мінулага года пасольства КНР у Беларусі прыпаднесла гамяльчанам і гасцям горада навагодні сюрпрыз — выстаўку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Кітая. Гамяльчане праявілі вялікую цікавасць да выстаўкі, аб чым сведчыць шматлікасць наведвальнікаў і пакінутыя запісы ў кнізе водзываў.

Напярэдадні Новага года па ўсходняму календару па ініцыятыве супрацоўнікаў абласнога музея і іх актыўнай падтрымцы, а таксама пры ўдзеле выкладчыкаў кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства быў падрыхтаваны цудоўны вечар. Ён прайшоў у выставачнай зале музея. Гаспадарамі і адначасова гасцямі вечара былі студэнты з КНР, якія вучацца ў нашым універсітэце. У цікавай форме з паказам экспанатаў выстаўкі студэнты расказалі гасцям аб палітычнай сітуацыі ў Кітаі, аб поспехах эканамічных рэформ, аб кітайскіх звычаях і традыцыях. Іх паведамленні перамяжоўваліся выступленнямі маладых талентаў. Былі выкананы ўрыўкі са славутай пекінскай оперы, гучалі чароўныя мелодыі іх далёкай радзімы і вершы кітайскіх паэтаў. Не меншым поспехам карысталася і выкананне кітайскімі студэнтамі рускіх народных песень і вершаў Пушкіна. З асаблівай цікавасцю госці гэтага вечара вучыліся разумець кітайскія іерогліфы, адведалі толькі дзвюмя палачкамі традыцыйную страву — кітайскі рыс.



Паміж кітайскім і беларускім народам ужо даўно склаліся добрыя адносіны і гэты вечар яшчэ больш замацаваў наша сяброўства і ўзаемаразуменне.

**Т.ШАЎЧЭНКА,**
**асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**

**На здымках: аб палітычнай сітуацыі ў Кітаі расказвае студэнт IV курса эканамічнага факультэта Ван Ліцянь; кітайскія мелодыі на флейце гучаць у выкананні студэнта IV курса філалагічнага факультэта Лі Міня.**

**Фота У.Чысціка.**

*Да вынікаў зімовай сесіі*

# І ПОСПЕХІ, І НЯЎДАЧЫ

Калі цяпер у дэканатах факультэтаў ужо мінуў час напружання ад зімовай экзаменацыйнай сесіі, то ў вучэбным аддзеле работы прыбавілася. Паступіўшыя сюды лічбавыя дадзеныя па вытрыманых студэнтамі экзаменах неабходна падсумаваць, прааналізаваць, каб скласці дакладную рэальную карціну аб узроўні паспяховасці як на кожным факультэце, так і ва універсітэце ў цэлым.

Усё, як вядома, пазнаецца ў параўнанні. Дык вось, калі нагадаць леташні абсалютны працэнт паспяховасці студэнтаў у зімовую сесію, то ён быў вышэйшы за сёлетні — 81,2 %. Цяпер ён складае 79,7 %. Гэты паказчык змяніўся ў горшы бок з-за павелічэння студэнтаў, якія "праваліліся" на экзаменах па прычыне вельмі дрэнных ведаў. Двоечнікаў сёлета аказалася 16 %, што на 3,1 % больш, чым мінулай зімой.

Аднак радуе тое, што стала больш круглых выдатнікаў — 18,9 % супраць 16,3 %. Рэзка зменшылася колькасць студэнтаў, якія здалі экзамены толькі на здавальняючыя адзнакі — з 3,7 % (летась) да 0,3 %. Атрымаўшых жа выдатныя і добрыя адзнакі крыху паменшала — з 29,3 % да 27,1 %.

Біялагічны факультэт па-ранейшаму з'яўляецца лідэрам па ўзроўню паспяховасці ва універсітэце. Тут абсалютны яе працэнт склаў сёлета 91,3 % (летась 90,7 %). Прыкметна палепшыў свае паказчыкі факультэт фізічнай культуры: з 74,6% узняўся да 82,1%. Паказчыкі ў бок паляпшэння назіраюцца таксама на геолага-геаграфічным факультэце — 84,2% (82,4%), фізічным факультэце -- 78,5% (74,8%), на матфаку — 72,3% (68%).

Астатнія факультэты, на жаль, вынікамі сесіі не парадавалі. Шмат двоек атрымалі студэнты філалагічнага, гісторыка-юрыдычнага і эканамічнага факультэтаў. На іх адпаведна студэнтаў з правaламі на экзаменах аказалася 143, 125 і 101. Будучыя філолагі знізілі ўзровень паспяховасці з 87,5% да 81,3%; гісторыкі і юрысты з 75,6 % да 74,5%; эканамісты з 88,5% да 79,2 %.

А як жа заявілі аб сабе 25 студэнтаў новай спецыяльнасці — псіхалогіі? Пачатак іх вучэбнай біяграфіі можна лічыць нядрэнным. Абсалютная паспяховасць складае тут 84 %.

Падагульняючы прыведзеныя лічбы і факты, трэба адзначыць, што нягледзячы на зніжэнне працэнта абсалютнай паспяховасці па універсітэту ў цэлым, можна сказаць: зімовая сесія гэтага года прайшла на больш якасным узроўні. Выкладчыкі праявілі належную строгасць і патрабавальнасць на экзаменах, і тыя студэнты, хто быў добра падрыхтаваны, заслужана атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі. Выявіліся і тыя юнакі і дзяўчаты, якім вучыцца цяжка. А, значыць, ім трэба больш працаваць над сабой.

**Н.ПАПКОВА,**
**начальнік вучэбнага аддзела.**

# ДВАЙНОЕ СВЯТА АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

Слаўны баявы шлях пройдзены Узброенымі Сіламі краіны за свае 80 гадоў. Гэтая юбілейная дата ўрачыста адзначана былымі абаронцамі Радзімы -- ветэранамі, воінамі-інтэрнацыяналістамі, тымі, хто сёння стаіць на варце рубяжоў нашай Айчыны.

Традыцыйныя сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, якія адстаялі мір і свабоду на нашай зямлі, шмат гадоў адпрацавалі ў ГДУ, прайшлі напярэдадні юбілейнай даты на ўсіх факультэтах універсітэта. Да студэнцкай моладзі прыходзілі паважаныя ветэраны: А.А.Косцікаў, А.М. Цурганаў, А.С.Калугін, Г.С.Мільчанка, В.М.Рупін, М.П.Шкарбун.

Яны падзяліліся сваімі ўспамінамі аб тых далёкіх ужо ваенных гадах, расказалі аб сённяшнім стане Узброеных Сіл Беларусі. Іх выступленні перад будучымі абаронцамі Айчыны -- своеасаблівы наказ моладзі працягваць слаўныя традыцыі Узброеных Сіл.



## ЖАНЧЫНАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Набліжаецца цудоўнае жаночае свята -- 8 Сакавіка. Яму будзе прысвечаны ўрачысты вечар у гонар Дня жанчын, які пройдзе ў актавай зале нашага універсітэта 6 сакавіка.

У праграме -- урачыстае ўшанаванне цудоўных прадстаўніц універсітэцкага калектыву, канцэрт мастацкай самадзейнасці.

**Пачатак -- у 17 гадзін.**

**Кожнае чарговае павышэнне зарплаты выклікае ў нас горкае расчараванне замест радаснага аптымізму. На вялікі жаль, дабрабыт наш не паляпшаецца, і хадзіць у магазін цяпер -- толькі настрой сабе псаваць. Цэны -- не па нашых кашальках.**

# ЦЭНЫ І ЗАРПЛАТА: ЗНАК РОЎНАСЦІ СТАВІЦЬ РАНА

Урадам Рэспублікі Беларусь пастаўлена задача ўдасканалення аплаты працы работнікаў. Гэта прадугледжвае забеспячэнне іх поўнай занятасці, навядзенне пэўнага парадку ў расстаноўцы кадраў, за што павінны несці персанальную адказнасць кіраўнікі калектываў, структурных падраздзяленняў. Так, напрыклад, работу па сумяшчальніцтву неабходна выконваць толькі ў вольны ад асноўнай працы час -- да або пасля яе, у абедзенны перапынак, выхадныя дні, водпуск. Часова дазваляецца сумяшчэнне вакантных пасад да прыняцця на работу патрэбнага чалавека. Даплаты спецыялістам і служачым за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне сферы абслугоўвання, павелічэнне аб'ёму выкананых работ могуць устанаўлівацца да 50 % акладу. Калі ж вакансія не запаўняецца праз пэўны час, яна скарачаецца са штатнага раскладу.

Умовы аплаты працы работнікаў, агульныя для ўсіх бюджэтных галін, уводзяцца не толькі за кошт бюджэтных асігнаванняў, але і за кошт сродкаў пазабюджэтных крыніц фінансавання.

З 1 студзеня 1998 года пасадавыя аклады па тарыфнай сетцы прафесарска-выкладчыцкага саставу ўстанаўліваюцца ў наступных памерах:

заг. кафедры -- 2665000 руб.;
прафесар -- 2540000 руб.;
дацэнт -- 2305000 руб.;
ст.выкладчык -- 2195000 руб.;
асістэнт, выкладчык -- 1990000 руб.;
выкладчык-стажор -- 1740000 руб.;
вядучы лабарант -- 1520000 руб.;
лабарант с вышэйшай адукацыяй -- 1240000 руб.;
лабарант з вышэйшай адукацыяй
I катэгорыі -- 1420000 руб.;
II катэгорыі -- 1325000 руб.;
лабарант з сярэдняй адукацыяй -- 1015000 руб.;
лабарант з сярэдняй адукацыяй
I катэгорыі -- 1160000 руб.;
II катэгорыі -- 1085000 руб.;

За стаж работы па спецыяльнасці (у галіне) пасадавыя аклады прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў павялічваюцца ў наступных памерах:

звыш 1 года -- на 5%;
звыш 5 гадоў -- на 10%;
звыш 10 гадоў -- на 15%;
звыш 15 гадоў -- на 20%.

За выкананне абавязкаў дэкана, нам. дэкана і вучонага сакратара ажыццяўляецца штомесячная даплата адпаведна ў памеры 350 тыс. руб.; 325 тыс.руб.; 235 тыс. руб.; даплаты за вучоную ступень: доктара навук -- 1.500 тыс. руб.; кандыдата навук -- 750 тыс. руб.

Пасадавыя аклады вучэбна-дапаможнага персаналу ўстаноўлены ў наступных памерах:

бібліятэкар:
I катэгорыі -- 1420000 руб.;
II катэгорыі -- 1325000 руб.;
бібліятэкар з сярэдняй спец. адукацыяй -- 1240000 руб.;
загадчык вучэбнай лабараторыі -- 1740000 руб.;
загадчык аддзела -- 1860000 руб.

### СТАЎКІ ПАГАДЗІННАЙ АПЛАТЫ

| N п/п | Кантынгент навучэнцаў | Стаўкі пагадзіннай аплаты працы ў працэнтах ад стаўкі першага разрада | | |
|---|---|---|---|---|
| | | прафесар, доктар | дацэнт, кандыдат навук | асобы, не маючыя вуч. ступені |
| 1. | Навучэнцы школ, гімназій, ліцэяў, каледжаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў і іншыя аналагічныя катэгорыі навучэнцаў, рабочыя, работнікі, займаючыя пасады, патрабуючыя сярэдняй спецыяльнай адукацыі, слухачы курсаў | (9%) 45000 | (8%) 40000 | (7,5%) 37500 |
| 2. | Студэнты | (11,6%) 58000 | (10,5%) 52500 | (8,5%) 42500 |
| 3. | Аспіранты, слухачы навучальных устаноў па павышэнню кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, слухачы курсаў па вывучэнню беларускай мовы | (14,7%) 73500 | (13,2%) 66000 | (11,6%) 58000 |

У маладзёжных арганізацыях

# СПРАВЫ НАДЗЁННЫЯ І ВАЖНЫЯ

Вось і пачаўся другі семестр. Для студэнтаў гэта вучоба, а для камітэта БПСМ універсітэта -- чарговы этап работы.

Што ж было зроблена?

На працягу першага семестра пярвічная арганізацыя БПСМ знаходзілася на этапе станаўлення, але работа ўсё ж такі вялася. Члены арганізацыі прынялі ўдзел у многіх мерапрыемствах, якія праводзіліся як на універсітэцкім, так і на агульнагарадскім узроўнях. Асабліва трэба адзначыць тыя мерапрыемствы, якія праводзіліся сумесна з культурным цэнтрам універсітэта: IV фестываль маладзёжнай песні, "Дні эканамічнага факультэта", дабрачынная навагодняя ёлка для дзяцей-інвалідаў.

26 лютага 1998 г. адбудзецца справаздачна-выбарная канферэнцыя пярвічнай арганізацыі БПСМ універсітэта. На парадак дня выносяцца наступныя пытанні:

-- справаздача камітэта за прайшоўшы перыяд;
-- выбары сакратара камітэта;
-- зацвярджэнне плана работы пярвічнай арганізацыі БПСМ на 1998 г.;
-- праграма супрацоўніцтва з адміністрацыяй універсітэта.

На канферэнцыю запрашаюцца ўсе жадаючыя. Месца і час правядзення будуць указаны дадаткова.

**А.ГАРБАЧОЎ,**
**сакратар камітэта БПСМ універсітэта.**



# ФІЗІКА І ТЭХНІЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ: ВЫНІКІ, ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Спецыялізацыя "Фізіка і тэхнічная творчасць" (ФТТ), якая існуе на фізічным факультэце нашага універсітэта, з'яўляецца унікальнай і ледзь не адзінай у рэспубліцы.

Неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў з кваліфікацыяй "Настаўнік фізікі. Педагог-арганізатар тэхнічнай творчасці" пацвярджаецца на самых розных узроўнях сістэмы адукацыі і адпавядае канцэпцыі адраджэння і пашырэння раней вельмі папулярнай гуртковай работы вучняў. Арыенцір на былых гурткоўцаў, ільготы пры паступленні пераможцаў выставак і спаборніцтваў даюць уяўленне аб кантынгенце студэнтаў спецыялізацыі, якіх на факультэце называюць "Умелыя рукі". У прынцыпе, згаджаючыся з такой інтэгральнай адзнакай якасцей рабят, трэба адзначыць яе як аванс для студэнтаў I курса і відавочную непаўнату для старэйшых курсаў, якія навучыліся выкарыстоўваць свае "оч. умелые ручки" з розумам, мэтанакіравана і з максімальнай карысцю. Гэта пацвярджаюць работы спецыялізацыі ФТТ у 1997 годзе і некаторыя моманты пачатку гэтага года.

Безумоўна, падзеяй мінулага года з'явілася "Выстаўка тэхнічнай творчасці фізічнага факультэта", якая праводзілася ў сакавіку-красавіку ў асноўным сіламі спецыялізацыі і заявіўшымі аб сабе творчымі клубамі "Мадэліст-канструктар" і "Электроніка", што асвятлялася ў "Гомельскім універсітэце" (N6 ад 8.04.97 г.). Наступіўшае затым зацішша ў знешняй рабоце спецыялізацыі завяршылася к канцу года сапраўдным феерверкам з боку студэнтаў V курса, адлюстраванае ў арганізацыі і правядзенні спаборніцтваў па скорасных кардавых авіямадэлях, а таксама ў падрыхтоўцы каля 40 "самаробак" для дзяцей-сірот, падораных ім на дабрачыннай ёлцы ў СШ N44. Трэба было бачыць вочы гэтых дзяцей, якія адразу ацанілі і якасць, і магчымасці дзейнічаючых мадэляў і цацак. Асабліва варта вызначыць арганізатараў і ініцыятараў гэтых мерапрыемстваў студэнтаў Г. Анікейчыка, Д.Цеплякова, В.Агеева і выказаць вялікую ўдзячнасць студэнтам гр. Ф-52.

Студзень гэтага года прайшоў для спецыялізацыі пад знакам пытання, хоць і даў вялікую "інфармацыю для роздуму". У канцы месяца праходзіла міністэрская праверка універсітэта па выхаваўчай рабоце, дзе вопыт работы спецыялізацыі і творчых клубаў быў адзначаны даволі высока. У канцы студзеня адбыўся семінар дырэктараў цэнтраў і станцый тэхнічнай творчасці вучняў вобласці з удзелам прадстаўнікоў Упраўлення адукацыі інстытута павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, дырэктара Рэспубліканскага Цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў В.І.Цвірко і прадстаўнікоў спецыялізацыі ФТТ ГДУ. Заслухаўшы кароткае меркаванне аб спецыялізацыі, семінар выказаў маральную падтрымку і пажаданні ўмацавання яе матэрыяльнай базы.

У 1999 годзе спаўняецца 70 гадоў тэхнічнай творчасці ў нашай краіне. Да гэтай даты спецыялізацыя рыхтуе матэрыялы для арганізацыі вялікай выстаўкі ў сценах універсітэта і ўжо атрымала запрашэнне для ўдзелу ў Юбілейнай Рэспубліканскай выстаўцы тэхнічнай творчасці. Работа прадбачыцца вялікая, акрамя вучэбных і арганізатарскіх спраў. Але ёсць усе падставы спадзявацца на поспех у гэтых карысных пачынаннях.

І яшчэ адна дата. У лютым споўнілася 50 гадоў загадчыку спецыялізацыяй ФТТ, доктару тэхнічных навук, прафесару Ігару Міхайлавічу Мельнічэнку. Хочацца ад імя студэнтаў і выкладчыкаў спецыялізацыі павіншаваць яго з гэтай датай, пажадаць энергіі, сіл у высакароднай справе развіцця і ўмацавання спецыялізацыі ФТТ.

**І.ЯКАЎЦАЎ, У.ЗАМЯТНІН,**
**ст.выкладчыкі кафедры агульнай фізікі.**

# БУДУЧЫНЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД МОЛАДЗІ



У нашай краіне існуе шмат маладзёжных суполак, арганізацый, як дзяржаўных, так і недзяржаўных. Кожная з іх ставіць свае мэты. У кожнай — свае накірункі, погляды на вырашэнне маладзёжных праблем у наш складаны эканамічны час. Адной з такіх арганізацый, бадай, самай вядомай, з'яўляецца Беларускі патрыятычны саюз моладзі. Сёння яго крытыкуюць як апаненты, так і тыя арганізацыі, у якіх пазіцыі, погляды на сучаснае становішча амаль такія ж, як і ў БПСМ. Наш саюз абвінавачваюць у марнай дзейнасці, якая не прыносіць ніякай карысці грамадству, у "праяданні" дзяржаўных сродкаў. Але гэта не так. БПСМ ставіць сваёй галоўнай задачай аб'яднаць моладзь краіны, выхоўваць сапраўдных патрыётаў, якія будуць клапаціцца і абараняць нацыянальныя інтарэсы.

Спектр дзеяння БПСМ вельмі шырокі. Ужо шмат чаго зроблена. Ідзе распрацоўка новых разнастайных сацыяльна-эканамічных і культурных маладзёжных праграм. БПСМ супрацоўнічае з многімі маладзёжнымі арганізацыямі СНД і далёкага замежжа, займаецца пытаннямі, якія найбольш хвалююць моладзь. Яркім прыкладам гэтага можа служыць нядаўні візіт дэлегацыі БПСМ у Грэцыю для ўстанаўлення сяброўскіх і дзелавых кантактаў, членам якой з'яўляўся і аўтар гэтых радкоў.

У бягучым годзе плануецца адправіць на адпачынак і аздараўленне групу дзяцей з Беларусі з малазабяспечаных сем'яў, а таксама дзяцей-сірот. А тое, што ім тут спадабаецца, няма ніякіх сумненняў: цудоўныя мясціны, старажытныя помнікі культуры і архітэктуры, прыгажосць Эгейскага мора, добразычлівыя людзі, якія падчас візіту нашай дэлегацыі сустрэлі нас з павагай, нейкай своеасаблівай гасціннасцю і цеплынёй, — усё гэта гаворыць само за сябе.

Сустрэчы на свяшчэннай грэчаскай зямлі асабіста ў маім жыцці не забудуцца ніколі. А тое, аб чым нам удалося дамовіцца з гаспадарамі гасціннай краіны, яшчэ больш радуе. Не толькі мы, але і дзеці, якім зараз цяжка, убачаць прыгажосць, адчуюць клапатлівыя рукі людзей краіны Легенд.

І ў далейшым, спадзяюся, што асноўнай палітыкай дзяржавы будзе маладзёжная. Іменна яна імкнецца садзейнічаць узвышэнню моладзі, выхоўваць у яе лепшыя якасці, каб ва ўсім свеце ведалі імя беларусаў.

**Віталь ДАВЫДАЎ,**
**студэнт гр. Б-32 філалагічнага факультэта, член Дзяржаўнага камітэта Беларусі па справах моладзі.**



**Паэзія пра беларускую мову**

## "СЭРЦАМ РОДНАГА СЛОВА КРАНІСЯ"

Кожная нацыянальная мова для адпаведнага народа з'яўляецца не толькі яго культурным здабыткам, але і летапісам гісторыі, эканомікі, усіх галін навукі. Кожная з гэтых моў нібы люстра знешняга аблічча і ўнутранага багацця народаў.

Гэтыя акалічнасці, відаць, выклікаюць у народаў адпаведныя адносіны да сваіх моў. Каб яшчэ больш і паўней усвядоміць гэта, вучоныя збіраюць у асобныя кнігі паэзію і публіцыстыку пра свае мовы. Так, праўда ўжо даўно, выпушчаны тоўстыя фаліянты такіх твораў пра рускую і ўкраінскую мовы.

Пра беларускую мову такой кніжкі да апошняга часу не было, калі не лічыць зборніка "Пісьменнік і мова" (Мінск: Навука і тэхніка, 1962. Складальнікі У.В. Анічэнка і А.І.Жураўскі).

Вельмі прыемна адзначыць, што зроблены рэальныя крокі да выдання аналагічнай фундаментальнай кнігі пра беларускую мову. У пачатку сакавіка ў кнігарнях з'явіцца другая хрэстаматыя вершаў пра беларускую мову для вучняў старэйшых класаў, студэнтаў і выкладчыкаў, усіх патрыётаў беларускай мовы "Сэрцам роднага слова краніся" (Мінск, "Народная асвета", 1998). Кніга рэкамендавана да выдання навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Складальнікамі гэтай хрэстаматыі з'яўляюцца прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце нашага універсітэта М.М.Воінаў і загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны К.С.Усовіч. На 295-ці старонках кнігі змешчаны 426 вершаў пра беларускую мову, уступны артыкул складальнікаў, тэматычны і імянны паказальнікі. 211 аўтараў прысвяцілі свае лепшыя словы, якія выйшлі з самых глыбокіх і ўзвышаных куточкаў сэрца, выразілі свае пачуцці і невычэрпную ўдзячнасць беларускай мове.

*Мова матчына!*
*Гучная, звонкая,*
*Ты ўвайшла ў маё сэрца даўно,*
*То шапочаш бярозкаю тонкаю,*
*То шуміш залатой збажынай.*
*Ты звініш жаўруковаю песняю*
*Над абсягам прыціхлых палёў,*
*Ручаінамі звоніш прадвеснімі,*
*То курлычаш жальбой жураўлёў.*
*Набіралася моцы стагоддзямі,*
*Прыгажэла,*
*мужнела,*
*расла.*
*Не гублялі цябе,*
*не знаходзілі —*
*Ты заўжды ў нашых сэрцах была.*

(Уладзімір Ляпёшкін).

Найбольшая колькасць вершаў, сабраных у хрэстаматыі, — пра абарону і абаронцаў беларускай мовы, важнае значэнне, неабходнасць, патрэбу і ролю для яе народа, краіны і чалавека; захапленне беларускай мовай, словам і прызнанне ім у любві; прыгажосць і багацце. Да найбольш значных раздзелаў зборніка адносіцца і той, дзе крытыкуюцца адмоўныя адносіны да багацейшага скарба беларускага народа. Нямала вершаў прысвечана і выхаванню ў чытачоў любві да нашай дзяржавы, беларускай мовы, усяго свайго роднага. Гэтая частка вершаў асабліва актыўна выхоўвае нацыянальную самасвядомасць маладога пакалення беларусаў.

*...Шлях свой асвецім словам, як промнем,*
*Прагэта і дзецям, і ўнукам напомнім.*
*Слова — выснова боскага царства,*
*Мова — замова ад зла і махлярства.*
*Мова — сумлення шчырая споведзь,*
*Душ і малення вечная повязь.*
*Вось і вясло вам, якому паверце:*
*З матчыным словам — рух у бяссмерце!*

(Пятрусь Макаль).

Якія паэты найбольш даражаць роднай мовай, хвалююцца за яе? Кніга вельмі абгрунтавана вылучае такіх паэтаў: Сяргей Грахоўскі, Рыгор Барадулін, Сяргей Панізнік і асабліва Ніл Гілевіч, якому, дарэчы, і прысвечаны гэты зборнік у знак удзячнасці за натхнёную абарону ім нашай роднай мовы. У зборніку вершаў Н.Гілевіча больш, чым любога іншага асобна ўзятага паэта. Апошнія з іх асабліва патрабавальныя і балючыя:

*"Назад!" — шалеюць санавітыя,*
*Назад! У чортаў калаўрот!..*
*А вы, наскрозь таленавітыя, —*
*Чаму не чуе вас народ?*
*Дзе ваша слова палымянае?*
*Чаму не б'еце вы ў званы?*
*Мо не для вас ярмо зламанае*
*Рыхтуюць зноў "апекуны"?*
*Вы што — не бачыце, як душыцца,*
*Як гіне мова наша ўсцяж?*
*Чаму ж не ўспыхне, не ўзварушыцца*
*Ваш дух, ваш розум, гонар ваш?..*

"Пасланне патулякам".

Трэба сказаць, што столькі ж вершаў было ўключана ў ранейшы зборнік паэзіі пра беларускую мову — "Каласы роднай мовы", які выйшаў у выдавецтве "Універсітэцкае" у 1990 г. (Дарэчы, гэты зборнік быў складзены супрацоўнікамі нашага ж універсітэта — прафесарам кафедры беларускай мовы У.В.Анічэнкам і загадчыкам музея-лабараторыі Ф.Скарыны К.С.Усовічам). У тым зборніку ў Н.Гілевіча таксама была вялікая падборка вершаў. Больш таго, любоў паэта да беларускай мовы вызначаецца і тым, што ён быў рэцэнзентам абодвух гэтых зборнікаў.

Паколькі размова зайшла і пра папярэдні паэтычны летапіс беларускай мовы, не лішнім будзе сказаць, што ў абодвух іх прадстаўлены 331 аўтар, а колькасць вершаў мала што не дасягнула адной тысячы.

У сувязі з гэтым можна канстатаваць, што ўся паэзія пра беларускую мову інвентарызавана. Складальнікі анатаванага зборніка "Сэрцам роднага слова краніся" пачалі працу над зборам публіцыстыкі пра беларускую мову.

**Святлана ТАБУЛІНА,**
**супрацоўніца музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**





**З выставачнай залы**

## УПЭЎНЕНЫЯ КРОКІ Ў МАСТАЦТВА

"Выстаўка -- гэта галоўнае, да чаго імкнецца кожны мастак", -- так ёміста акрэсліў выкладчык Гомельскага філіяла Мінскага мастацкага вучылішча імя Глебава пры Беларускай акадэміі мастацтваў П.Р.Лук'яненка прызначэнне творчай асобы, якая з дапамогай алоўка, пэндзля і фарбаў выказвае свае пачуцці, настрой на ватмане, на палатне. Яна -- як падвядзенне вынікаў пэўнага творчага этапа, як вучоба, асэнсаванне свайго "я" у мастацтве.

Дзевяць выхаванцаў вучылішча, якія зараз вучацца на III курсе, вынеслі на суд гледача свае работы -- жывапіс і графіку. Выставачная зала нашага універсітэта як заўсёды гасцінна прыняла новых аўтараў. Сяргея Радчанку, праўда, тут ужо добра ведаюць, бо менавіта ў гэтай зале яшчэ ў канцы мінулага года дэманстравалася яго персанальная выстаўка. Прайшла яна з вялікім поспехам. Шматлікія наведвальнікі высока ацанілі пейзажы і партрэты таленавітага мастака. Цяпер яго новыя, не менш цікавыя і сур'ёзныя работы, дэманструюцца разам з творамі яго калег-аднакурснікаў. Тут жа ў папярэдняй экспазіцыі выстаўляліся і работы В.Казлоўскай.

Я.Аўрусевіч, К.Прусаў таксама паказваюць свае творы не ўпершыню. Яны былі ўдзельнікамі выстаўкі гомельскіх мастакоў восенню мінулага года ў час святкавання 850-годдзя г.Гомеля і 200-годдзя яго палаца-паркавага ансамбля.

А вось Т.Голдусь, Ю.Старыкава, Ю.Кузьмянцова, І.Спадабаева, Л.Камінская -- сапраўдныя навічкі на выстаўцы. Іх пейзажы, нацюрморты, партрэты і эцюды дэманструюцца ўпершыню. Але іх нельга назваць нясмелымі, недасканалымі. Бачанне гэтымі аўтарамі навакольнага свету, яго прыгажосці, маляўнічасці прыроды, знешняй і ўнутранай прывабнасці чалавека ўражвае гледача, не пакідае яго раўнадушным. Кожная іх работа па-свойму адметная, цікавая. "Восень", "Чэрвень", "Зімовы эцюд", "Ціхі вечар", "Партрэт мужчыны ў капелюшы" і іншыя палотны выкананы па-майстэрску, адчуваецца, што ў іх укладзена часцінка душы кожнага аўтара.

Шлях да прызнання, да творчых вяршынь не бывае лёгкім. Гэта добра разумеюць будучыя мастакі, якія робяць свае першыя, але даволі ўпэўненыя крокі ў мастацтва. А яшчэ яны ведаюць: трэба працаваць і працаваць, шліфаваць сваё майстэрства.

**Т.ДУБЯК.**

## ЦІ БУДЗЕ РАЙ ЗЯМНЫ?

Нядаўна ў абласной бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі Васіля Ткачова "Мой рай зямны". Сярод запрошаных былі навучэнцы школ, ліцэяў, выкладчыкі і людзі, якім неабыякава творчасць гэтага таленавітага чалавека. Завіталі сюды і мы -- студэнты гр. Н-14 філалагічнага факультэта. І не пашкадавалі аб гэтым, бо сапраўды творчасць названага пісьменніка прыцягвае да сябе сваёй непаўторнай выразнасцю.

На вечарыне, дзе Васіль Ткачоў пазнаёміў сваіх прыхільнікаў і з толькі што выдадзенай кнігай "Карасі на пяску", а таксама зборнікам гумарэсак, панавала атмасфера цеплыні і ўзаемаразумення.

**Наталля КАЗЛОВА,**
**студэнтка гр. Н-14 філалагічнага факультэта.**

## АБ РЭСПУБЛІКАНСКІХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

З 14 па 17 красакавіка г.г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі пройдзе XXXIV навукова-тэхнічная канферэнцыя аспірантаў і студэнтаў. У яе рамках будзе арганізавана работа 27 секцый.

◆◆◆

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і БКЦ НДРС паведамляюць, што IV рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў з удзелам лаўрэатаў конкурсу навуковых работ студэнтаў Беларусі па гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навуках 1997 г. будзе праводзіцца ў канцы верасня г.г. у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы. У праграме канферэнцыі будуць працаваць 24 секцыі.

***Лепшыя матэрыялы дакладаў гэтых канферэнцый будуць апублікаваны. За дадатковай інфармацыяй звяртацца да адказных за навукова-даследчую работу студэнтаў на факультэтах.***

**ЦС па НДРС.**

## УДАКЛАДНЕННЕ

У папярэднім нумары нашай газеты ў артыкуле "Як правільна аформіць спіс апублікаваных работ" па віне аўтара дапушчаны недакладнасці. У першай калонцы ў 24-м радку знізу замест лічбы (2) трэба чытаць (3), далей па тэксту ў артыкуле таксама 2 мяняецца на 3.



### МИР ЦВЕТОВ -- МИР ПРЕКРАСНЫЙ

**Нельзя представить нашу жизнь без цветов, растений. С ними нам теплее, уютнее, радостнее. Но, к сожалению, не многие знают об элементарных вещах -- как и какие цветы дарить друг другу в разных жизненных ситуациях, как подольше сохранить их свежесть, как выращивать их самим и ухаживать за ними. Это, оказывается, целая наука. Постичь ее основные элементы поможет нам на страницах нашей газеты доцент кафедры ботаники и физиологии растений ГГУ Р.И.Маркелова.**

## ГВОЗДИКА

Этот цветок -- символ необычных событий в обществе: борьбы, мятежей, революций, ярких больших торжеств. Он символизирует силу, мужество, преданность, благородство. На латинском языке гвоздику называют "диантус" от слов "диос" и "антос" -- божественный цветок. Греческая легенда звучит так. После неудачной охоты богиня Диана встречает пастушка, прекрасно играющего на свирели. Вне себя от ярости она обвиняет мальчика, что он своей игрой распугал всю дичь и, несмотря на его мольбы о пощаде, вырывает глаза у пастушка. Опомнившись и глубоко сожалея о содеянном, она бросает глаза на землю и Зевс превращает окровавленные глаза в красные цветы, которые и получили название "диантус" -- гвоздика.

В природной обстановке встречаются около 300 видов трав (редко полукустарников) рода Гвоздика. Родина их -- страны Средиземноморья. В Республике Беларусь встречается 9 видов этого рода, некоторые из них из-за красоты цветков оказались на грани исчезновения.

Селекционеры на основании трех видов гвоздик -- садовой, турецкой и китайской вывели тысячи форм, групп, декоративных разновидностей, гибридов культурных гвоздик самой разнообразной формы и окраски: от красной до темно-бордовой, почти черной. У некоторых сортов окраска цветка меняется в течение дня от белой до пунцовой. Есть цветы 15 см в диаметре с 60 лепестками (у дикорастущей -- 5).

Цветок гвоздики дарят участникам юбилейных торжеств, дорогим и любимым людям, артистам. Мужчинам принято дарить цветы гвоздик с более темными оттенками лепестков, а женщинам -- более нежных тонов -- розовых, белых, оранжевых и их сочетаний. Даже один цветок в красивой упаковке уместен для подарка в кругу близких людей. Для торжественного стола, конечно, нужны букеты из большего количества цветков. Гвоздика красива с оранжировочной зеленью -- листьями аспарагуса, папоротников и без нее в хрустальной вазе или металлической ручной чеканки. Цветы ее стоят в воде до 20 дней. Для продления жизни цветов в воду добавляют борную кислоту (0,1 г на 1 литр воды), сахар (2-3% раствор) или специальные таблетки, выпускаемые химической промышленностью. Иногда в воду опускают серебряные предметы.

Красная гвоздика -- прекрасный подарок к празднику 23 февраля защитникам Отечества как олицетворение радости от победы Жизни!

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

# НА ЮБІЛЕІ АЛІМПІЙСКАЙ ЧЭМПІЁНКІ

Споўнілася 60 гадоў знакамітай фехтавальшчыцы трохразовай алімпійскай чэмпіёнцы, пяціразовай чэмпіёнцы свету, шматразовай чэмпіёнцы СССР і Беларусі, заслужанаму майстру спорту, заслужанаму дзеячу фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь Таццяне Дзмітраўне Самусенка. З юбілеем яе горача віншавалі ўсе прыхільнікі выключнага таленту праслаўленай спартсменкі.

На юбілейных урачыстасцях Т.Д.Самусенка ад Гомельшчыны ўдзельнічалі 3 прадстаўнікі спартыўнай плеяды, у тым ліку майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту нашага універсітэта В.В.Лісоўскі.

У гонар юбіляркі праведзены турніры мацнейшых дзейнічаючых фехтавальшчыкаў і ветэранаў гэтага віду спорту.

В.В.Лісоўскі выступаў у групе шпажыстаў, чый узрост перавышаў 50 гадоў. Ён праіграў толькі адзін укол майстру спорту СССР Васілю Самцову з Брэста і заняў 2-е месца.

Нагадаем, што сёлета ў жніўні ў ЗША павінны адбыцца сусветныя гульні ветэранаў-фехтавальшчыкаў. Ёсць папярэдняя дамоўленасць з АТ "Мінскпраект", якое спансіруе паездку В.В.Лісоўскага на гэтыя прэстыжныя спаборніцтвы.

**Змяшчаемы фотаздымак быў зроблены на турніры фехтавальшчыкаў, прысвечаным юбілею Т.Д.Самусенка.** *Справа налева:* **алімпійскі чэмпіён, пяціразовы чэмпіён свету Аляксандр Раманькоў, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Венедзікт Лісоўскі, алімпійскі чэмпіён Барыс Карэцкі, майстар спорту па сучаснаму пяцібор'ю Валерый Жолудзеў.**



# ТРЫ ЎЗНАГАРОДЫ СТУДЭНТАЎ

У спартыўным комплексе г. п. Касцюкоўка праведзены чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па грэка-рымскай барацьбе. Зборны калектыў Гомельшчыны заваяваў агульнае III каманднае месца. Тры ўзнагароды на рахунку асілкаў факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта. Вялікі поспех выпаў на долю майстра спорту Уладзіміра Слесарэнкі. У вагавай катэгорыі да 69 кг ён упершыню заваяваў сярэбраную ўзнагароду. На другую прыступку гонару ўзняўся і яго аднакурснік майстар спорту міжнароднага класа Вячаслаў Макаранка (85 кг). Трэцім прызёрам стаў майстар спорту Сяргей Геўрасёў, які выступаў у цяжкай вагавай катэгорыі.

**С.ДЗЕГЦЯРОЎ, трэнер.**

# БЫЛО АД ЧАГО ПАРАДАВАЦЦА

У Гомелі адбыліся зімовыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на Кубак Рэспублікі Беларусь. На жаль, спартсмены Гомельшчыны на гэты раз высокімі дасягненнямі не парадавалі і значна адсталі ад прызёраў.

Не вельмі прадстаўнічым быў і наш універсітэт. Толькі пахвальнае слова можна сказаць у адрас студэнта 2-га курса факультэта фізічнай культуры Уладзіміра Касцючыка (трэнер -- ст.выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту В.К.Кірзеў). На дыстанцыі 60 м з бар'ерамі ён паказаў вынік 8.05 сек. і заняў II месца. Але гэты вынік быў для яго па-асабліваму радасным. Уладзімір выканаў нарматыў майстра спорту Рэспублікі Беларусь.

## *Вясёлы перапынак*

# ВЫКЛАДЧЫКІ І СТУДЭНТЫ

☺☺☺

Прафесар -- аўдыторыі:

-- Перастаньце, калі ласка, увесь час перадаваць адзін аднаму запіскі. Мне гэта перашкаджае чытаць лекцыю.

-- Гэта не запіскі, а карты -- мы гуляем у брыдж.

-- О, тады прабачце.

☺☺☺

На лекцыі прафесар гаворыць:

-- Прырода вельмі дакладна прадумала ўстройства нашага арганізма. Каб мы бачылі, колькі мы пераядаем, наш жывот знаходзіцца на тым жа баку цела, што і вочы.

☺☺☺

Сярод выкладчыкаў:

-- Калега, для таго, каб добра гаварыць, трэба мець вялікі запас слоў, а таму неабходна шмат чытаць.

-- Не думаю, што справа менавіта ў гэтым. Мая жонка зусім нічога не чытае, але як пачне гаварыць, дык яе нельга спыніць.

☺☺☺

-- Вы не размаўляеце ў сне? -- пытаецца доктар у пацыента.

-- Не, доктар, хоць я нярэдка гавару, калі іншыя спяць.

-- Гэта як?

-- Я чытаю лекцыі ва універсітэце.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- эканамічных тэорый -- дацэнта;
-- ВМ і праграміравання -- дацэнта;
-- геаграфіі -- дацэнта;
-- агульнай фізікі -- дацэнта; асістэнта /0,5/.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 226699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры беларускай мовы выказваюць глыбокае спачуванне прафесару названай кафедры **АНІЧЭНКУ Уладзіміру Васільевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БРАТА**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі і студэнты філалагічнага факультэта, калектыў кафедры беларускай мовы выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана факультэта па выхаваўчай рабоце **КУЗЬМІЧУ Леаніду Пятровічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 79.
Падпісана да друку 21.02.98.